Магістрат



«МАГІСТРАТ» — Газэта Віцебскай Рады Партыі БНФ №1(83), лістапад, 2016г.

ЗАЯВА СОЙМУ ПАРТЫІ БНФ ПА ВЫНІКАХ ПАРЛЯМЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ

Палата прадстаўнікоў VI скліканьня не можа лічыцца выразьнікам волі беларускага народа

Заява Сойму Партыі БНФ 7 кастрычніка 2016 г.

Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь VI скліканьня, якія адбыліся 11 верасня, былі зладжаны паводле звычайнай для Беларусі схемы татальных незаконных маніпуляцыяў. Нязьменнасьць прынцыповых недахопаў выбарчага заканадаўства, шматлікія факты перасьледу і ціску на кандыдатаў ад Партыі БНФ, а таксама дадзеныя назіральнікаў Партыі БНФ і Грамадзкага аб'яднаньня БНФ "Адраджэньне" (роўна як і паведамленьні нешмалікіх прадстаўнікоў Фронту, якія былі ўключаныя ў склад выбарчых камісіяў) аб меньшай за неабходныя 50% рэальнай яўцы ды адсутнасьць адкрытага падліку галасоў на шматлікіх участках у Менску ды іншых буйных гарадах яскрава сьведчаць: Палата прадстаўнікоў шостага скліканьня, як і ўсе папярэднія склады гэтага органа, з'яўляецца прызначанай, а не абранай народам на свабодных і справядлівых выбарах, і ня можа адлюстроўваць палітычную волю беларусаў.

Усе зьмены альбо "касметычныя паляпшэньні", пра якія кажуць асобныя замежныя назіральнікі, не маюць прынцыповага значэння і палягаюць выключна ў сфэры рыторыкі, а не рэальнага рэфармаваньня выбарчых працэдураў. БНФ цалкам падтрымлівае ацэнку выбараў як несвабодных і несправядлівых з боку міжпартыйнай кампаніі назіраньня "Права Выбару-2016", у якой нашая партыя брала актыўны ўдзел. Мы заклікаем місію назірання БДІПЧ АБСЭ ў сваёй канчатковай справаздачы таксама дасьць адэкватную ацэнку выбарчай кампаніі і не заплюшчваць вочы на яе недахопы. Асаблівую увагу назіральнікаў АБСЭ мы зьвяртаем на павелічэньне ціску і рэпрэсіяў на экс-кандыдатаў і ўдзельнікаў кампаніі назіраньня ў першыя ж тыдні пасьля выбараў (уключна з адміністратыўнымі штрафамі), а таксама на тое, што ў Беларусі цяпер як мінімум тры прызнаныя праваабаронцамі палітвязьні знаходзяцца за кратамі.

Тое, што сярод прызначаных дэпутатаў у першыню за доўгія гады апынуліся дзве прадстаўніцы незалежных ад рэжыму грамадзкіх структураў (намесьніца старшыні Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны ды каардынатарка аргнамітэту Кангрэсу за незалежнасьць Алена Анісім, а таксама прадстаўніца АГП Ганна Канапацкая) не мяняе нашай ацэнкі гэтых выбараў і гэтага складу парламенту як не маючых нічога агульнага з сапраўдным волевыяўленнем грамадзян.

Разам з тым мы заклікаем спадарыню **Алену Анісім** і спадарыню **Ганну Канапацкую** напоўніцу выкарыстоўваць тыя сьціплыя магчымасьці, якія дае статус дэпутата, каб з парлямэнцкай трыбуны ставіць на палітычны парадак дня жыцьцёва важныя для Беларусі пытаньні, датычныя:

- Неабходнасьці дзяржаўнай палітыкі ў накірунку ўмацаваньня беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці, адраджэньня беларускай мовы і культуры.

- Забесьпячэньня рэальнага сувэрэнітэту краіны, што вымагае выхаду з антыканстытуцыйных утварэньняў накшталт Саюзнай дзяржавы, спыненьня ўдзелу нашай краіны ў небясьпечных для нашай незалежнасьці структурах Эўразійскага эканамічнага зьвязу і Арганізацыі дамовы аб калектыўнай бясьпецы, а таксама выдаленьня з Беларусі расейскіх вайсковых аб'ектаў (пытаньне пра магчымасьць працягу арэнды якіх прыпадае акурат на кадэнцыю новага складу Палаты прадстаўнікоў).

- Прыняцьця неадкладных захадаў па забеспячэньні бясьпекі і здароў'я насельніцтва Беларусі, у тым ліку ўвядзення кантроля на мяжы паміж Беларусьсю і Расеяй дзеля спыненьня плыні наркотыкаў, зброі і злачыннасьці, што цяпер бесперашкодна трапляюць у нашу краіну з Усходу.

- Вызваленьня прыватнай ініцыятывы беларусаў, рэальных захадаў дзеля падтрымкі малога ды сярэдняга бізнэсу, гарантыяў недатыкальнасьці прыватнай уласнасьці, стварэньня ў краіне канкурэнцыйнага асяродзьдзя.

Мы таксама разічваем, што прапановы па дэмакратызацыі выбарчага заканадаўства, аформленыя міжпартыйнай кампаніяй назіраньня "Права выбару" у выглядзе законапраекта, стануць асновай для дзейнасьці прадстаўнікоў дэмакратычнай грамадзкасьці ў парлямэнце. Мы дэкляруем сваю падтрымку ўсім заканадаўчым ініцыятывам, скіраваным на рэальнае рэфармаваньне выбарчага заканадаўства Беларусі.

Мы з засьцярогай успрымаем зьмяненьне рыторыкі асобных эўрапэйскіх палітыкаў у накірунку зьмяненьня стаўленьня да Палаты прадстаўнікоў. Наладжваньне кантактаў паміж Беларусьсю і Захадам не павіннае ставіць пад сумнеў эўрапэйскія каштоўнасьці дэмакратыі і прынцыпы правоў чалавека.

Грунтуючыся на пералічаных вышэй фактах мы канстатуем, што ў часе гэтых парламенцкіх выбараў афіцыйны Менск не зрабіў нічога, што магло бы быць нагодай для прызнаньне іх дэмакратычнымі. З улікам выкладзенага месца беларускага парлямэнту ў Парлямэнцкай Асамблеі Усходняга партнэрства "Эўранэст" павіннае заставацца вакантным.

Магістрат

Заснавальнік:
Віцебская Рада
Партыі БНФ

Выдавец:
Віцебская Рада
Партыі БНФ

Рэдактар:
Канстанцін Смолікаў

Адказны за выпуск:
Хведар Самагуд

Дызайн:
Сяржук Серабро

Вёрстка:
Сямён Залацец

Дапамога:
Віцебскі Цэнтр
грамадзкіх ініцыятываў

Наклад:
299 паасобнікаў

Пункты погляду рэдакцыі і аўтараў могуць не супадаць.

Друкуецца на правах рукапісу для ўнутранага карыстаньня

Можа выкарыстоўвацца ў рэкламных і агітацыйных мэтах.

Тэлефоны для кантактаў:
8-029- 710-42-23, 713-22-00, 218-98-38, 711-24-47, 593-15-34, 651-32-53, 517-32-53, fax 66-18-47.



Віцебская абласная арганізацыя партыі БНФ: вул.Церашковай, д.11, п.№.1.13, Віцебск, Рэспубліка Беларусь, 210035

E-mail: kas_vit@tut.by

WWW.NARODNY.ORG

http://kamunikat.org/mahistrat.html

ВЕЖЛИВЫЕ ЛЮДИ

Приняв участие в качестве независимого наблюдателя на последних парламентских выборах на участке № 22 по Горьковскому-Витебскому округу № 17 города Витебска, по которому выдвигался демократический кандидат Христофор Желяпов, я смог получить для себя бесценный опыт и знания, которые, наверняка, я не смог бы получить где-то еще. Например, я впервые, в полной мере, понял и осознал весь смысл словосочетания "вежливые люди", столь популярное в последнее время в связи с аннексией Крыма и всей последующей за ней историей. Такими самыми вежливыми людьми была наполнена вся участковая комиссия, располагавшаяся в средней школе № 18 и полностью состоящая из учителей и под предводительством завуча данной школы Акимовой Елены Валерьевны.

Они все вели себя суперкорректно и подчеркнуто вежливо по отношению ко мне. Предлагали кофе и пирожки. И даже носили вслед за мной стул. Куда я передвигался по участку, туда и стул за мной переставляли. И спрашивали "Чего еще изволите-с". Но при этом грубо и открыто занимались фальсификацией: вывешивали заранее написанный итоговый протокол на досрочных выборах еще до окончания голосования (на что я тут же написал жалобу в окружную комиссию), приписывали явку на досрочном голосовании, и самое главное при передаче из участковой в окружную комиссию подменили итоговый протокол, завысив количество проголосовавших в основной день почти в два раза (на что было подано соответствующее обращение в Следственный Комитет). И всегда при этом были очень вежливы и только и говорили "Может чего еще изволите-с?". Фальсифицировали и спрашивали, фальсифицировали и спрашивали. Вежливость не знала границ, как, впрочем, и фальсификации. В Украине "Вежливые люди" отстаивали интересы России, а чьи интересы отстаивают наши вежливые люди?

В.В.Кийко

ХОМА НЕВЕРУЮЩИЙ

Говорят, был человек, который никому никогда не верил и все ставил под сомнения и из-за чего и попал в историю. Не в том смысле, что он в неё "влип", а в том, что сведения о нем передаются из поколения в поколения. Я тоже недавно с таким познакомился. Зовут его **Дмитрий Хома**, которому посчастливилось "вытянуть счастливый билет" и стать на последних парламентских выборах председателем Витебской областной избирательной комиссии. И он тоже мало чему и кому верил, из-за чего он таки и попал в историю, но уже в том смысле, что "влип" в нее. А точнее не в историю, а в судебное разбирательство из-за своего неверия.

Дело в том, что я подавал жалобу в областную избирательную комиссии, которую и возглавлял Хома, на решение окружной избирательной комиссии, отказавшей мне в регистрации в качестве кандидата в депутаты. Основной причиной нерегистрации, стала ксерокопия трудовой книжки, в которой название фирмы немного отличается от названия, указанного в реестре юридических лиц. Это произошло из-за того, что фирма немного поменяла названия и из ТСП стала ТСП-тур, а в трудовую книжку не внесла изменения. Все эти доводы и факты я изложил в жалобе, направленной в областную комиссию. Но данная комиссия в лице Дмитрия Хомы этому всему не поверила. А сам Хома меня обвинил, в том, что я подделал ксерокопию, чтобы ввести их в заблуждение. Поэтому мне пришлось подавать жалобу в Витебский областной суд уже на решение областной избирательной комиссии. На суде подтвердились все мои доводы, указанные в жалобе в областную комиссию (были предоставлены письмо от работодателя, в котором указывалось, что я действительно работаю в данной фирме и в данной должности, а также выписка из реестра юридических лиц). Но, тем не менее суд, как это у нас всегда бывает, встал на сторону комиссии. Если бы суд происходил в какой-нибудь цивилизованной стране, то решение было бы в мою пользу. После принятого судебного решения я сказал, "что основная задача суда состоит в том, чтобы устанавливать истину, а не цепляться за формальные закорючки. Так что не понятно зачем вообще нужен суд, если он не принимает во внимание доводы и факты, а просто выносит формальные решения, работая по принципу конвейера".

Действительно, а для чего существует суд у нас?

В.В.Кийко

ДАСЫЛАЙЦЕ АХВЯРАВАНЬНІ НА ДЗЕЙНАСЬЦЬ ГА БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
Рэквізыты: р/р 3015100147004 ААТ "Белзнешэканомбанк" філіял Мінскае аддзяленьне № 1 код 226, УНП: 100052236 "прызначэньне плацяжу" — "бязвыплатны ўзнос"

А НАМ ПАДАБАЕЦЦА…

Колькі дзён таму я прачытаў верш **Васіля Зуёнка** "Не быў беларусам…" (часопіс "Дзеяслоў", №12 за 2013 год). Прывяду частку верша:

О Божа, Тварэц Усявышні,
Успомні – на момант хаця б, –
Што я ў тваім свеце не лішні
І ў свеце людскім не раб.

Ты даў мне такую зямліцу, –
Што сам не знаходзіш прычын
Супроць, каб на ёй пасяліцца, –
Калі б не сусветны твой чын…

О Божа, твой клопат глабальны:
Каб з тропу не збіўся Сусвет.
А чуў, як са словам пахвальным
Глядзіць на нас кожны сусед?

Такая зямліца! – о Божа,
Ды як жа яе не любіць!?
І хто ў той любві пераможа,
Суседзі не могуць рашыць…

На самой справе ў цэнтры Еўропы Бог абраў зямліцу такую, што сам бы пажадаў на ёй пасяліцца.

Гэтую зямліцу ён засяліў цудоўным народам: цярплівым, працалюбівым, з шматлікімі талентамі, міралюбным.

Але каб людзі на гэтай зямлі не былі надвычай ганарлівымі і разбэшчанымі Бог даў ім злоснага, крыважэрнага, агрэсіўнага суседа, які пяць вякоў здзекваецца з гэтага народу і палівае зямліцу крывёю праведных мучанікаў.

І вось праз пяць стагоддзяў апасьля самога жорсткага і крывавага века заецца Творца зміласціўіўся над беларусамі за іх мукі і цярплівасць і даў ім волю самім вырашаць свой лёс і лёс даравана й ім зямліцы.

Але ці Лукавы ўсяліўся ў жыхароў гэтай зямлі ці Бог пабачыў, што яны не гатовыя вырашаць яе лёс лепшым чынам, але народ пакарыўся новаму Тырану. І ўжо Сатана стаў правіць баль на зямлі беларускай, адцягвае яе насельнікаў ад галоўных божых прыпаведзей: не крадзі, не сведчы ілжыва.

За дваццаць год тысячы і мільёны людзей сталі злачынцамі, зрабіўшы хлусьню і няпраўду законам свайго жыцця.

Новы Тыран спачатку прымушаў іх хлусіць, потым яны дабраахвотна сталі гэта рабіць за падачкі, а праз 20 год хлусьня для шмат каго з іх стала самім жыццём, а некаторыя сталі пра гэта казаць "а нам падабаецца".

Пад час выбарчай кампаніі 2016 года я зайшоў у рэдакцыю самай папулярнай газэты Віцебска каб аддаць у друк сваю передвыбарчую праграму.

Слова за слова гаворка зайшла аб незалежнасці прэсы. На мае заўвагі аб тым, што я разумею інтарэсы газэты, якую фінансуе улада, мае суразмоўцы адказалі, што не атрымліваюць ні капейкі з дзяржаўнага бюджэта і цалкам фінансава незалежныя.

Я са здзіўленнем кажу:"Але чаму тады вы ім прыслужваеце?". І чую ў адказ: "А нам падабаецца,"

Раней казалі няпраўду таму, што ім за гэта плацілі, зараз таму, што падабаецца.

Выбарчая кампанія кожны раз робіць злачынчамі дзясяткі і сотні ў асноўнай масе разумных людзей.

Больш дакладна, не сама выбарчая кампанія, а тыя, што ёй кіруе.

Вышэйшы кіраўнік загадвае кіраўніку галоўнай выбарчай камісіі парушаць Закон аб выбарах. Глава выбаркама аддае прыказы аб парушэнні Закона ўніз па верцікалі выбаркамаў, парламент і ўрад уніз па верцікалі Саветаў і выканкамаў.

У гэты колаварот законазлачынцаў уцягваюцца члены і валанцёры дзясяткаў грамадскіх аб'яднанняў і партыяў, якія кормяцца ад улады.

Давайце паспрабуем прыблізна падлічыць: Цэнтарвыбаркам – 12 членаў, абласныя выбарчыя камісіі і горада Мінска 91, акружныя выбарчыя камісіі 1430 членаў, участковыя выбарчыя камісіі 65856. Разам 67389 членаў выбарчых камісіяў рознага ўзроўню падпісываюць фальшывыя пратаколы, ведаючы, што іх дзеянні незаконныя і падпадаюць пад артыкул 191 і 192 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. У кожнай камісіі па 3-4 назіральніка ад "Чырвонага Крыжа", БРСМ, жаночых арганізацыяў, ГА "Белая Русь", прафсаюзаў, Саветаў ветэранаў, Саюза афіцэраў і "афганцаў", і шмат якіх яшчэ арганізацыяў.

Яны ўсе з'яўляюцца сведкамі фальсіфікацыі пры падліку галасоў і складанні пратаколу. Чыноўнікі каля 200 выканкамаў, якія кантралююць працэс, дыктуюць старшыням і сакратарам выбарчых камісіяў лічбы, якія неабходна ўнесьці ў пратаколы.

Гэта ўсё разумныя, але законазлачынныя грамадзяне: настаўнікі, дырэктара, інжынеры, студэнты, работнікі устаноў аховы здароў'я, культуры і камунальнай гаспадаркі.

І вось іх усіх "бес папутал" і яны парушылі закон. Праўда, шмат з іх атрымалі ўзнагароды у выглядзе банкнот і манет. Але гэта каб заглушыць голас анёлаахоўніка.

Пасьля выбараў па Віцебскай-Горкаўскай №17 выбарчай акрузе назіральнікі Кампаніі "Права выбару" Сверчкова А.І. (участак №27), Ільеня Д.Г. і Ільеня Г.А. (участак №29), Бурко А.М. і Назарава Е.Н. (участак №4), Сцепанішчава В.А. і Ільінец А.І. (участак №23) склалі Акты і напісалі заявы аб парушэннях Закона аб выбарах пры падліку галасоў.

Акружная камісія адрэагавала адпаведна правілаў і стварыла камісію для праверкі. Гэтую камісію ўзначаліла сама намесніца старшыні АК Праналоцкая Т.С. І вось гэтая камісія па праверцы выявіла, што вышэйназваныя назіральнікі былі неправыя.

А іх няпраўду падцвердзілі вусна і пісьмова іншыя назіральнікі, тыя самыя, ад "Чырвонага Крыжа", БРСМ, ГА "Белая Русь", кампартыі, прафсаюзаў Саўчанкаў С.П., Савіцкая Т.В., Багачэнка В.І., Барэйша Ю.П., Рагажынская С.В., Ананьева В.А., Дунец А.В., Касарэўская О.В., Бажанаў А.Н., Калашнікава І.Г., Бурунова Т.М., Крылова А.Л., Лізанец В.В.

Раней мы дзівіліся, навошта на аднаго назіральніка яшчэ чатырыпяць ад улады, бо ўлада можа пісаць што заўгодна.

А вось для чаго. Каб на аднага сведкуназіральніка, які можа сказаць: камісія парушыла Закон, было чатырыпяць ілжэсведкаў, якія цьвердзяць, што "усё было чэсна".

У нас за такое ілжэсведчанне не судзяць. У нас і суды сведкаў караюць, а ілжэсведкаў хваляць.

– Божа, за што ты даў нам такую ўладу?

– "Хужэйшай не знайшоў."

Развважаў аб зямлі і яе людзях Хрыстафор Жаляпаў.

ИЗ ЖИЗНИ АЛЕСЯ ШУТОВА

13 ноября 2016 года исполнилось 40 дней со дня смерти оршанского общественного и партийного деятеля Александра Эдуардовича Шутова.

Оршанские журналисты вспомнили несколько историй из жизни Алеся Шутова (в сокращении).

Фронтовец

Та встреча с Андреем Мельниковым, хотя и была решающей для политических взглядов и общественной активности Алеся, но была не первым знакомством с Беларусским народным фронтом. Первое закончилось непониманием. Не секрет, что БНФ всегда смело проводил филологические эксперименты - это касается и количества языков, на которых фронтовцы публиковали листовки (БНФ единственная политическая организация, которая публиковала листовки на обоих государственных языках, языках соседних стран для регионов с большой долей национальных меньшинств и использовала даже цыганский язык) и частое использование старого беларусского правописания - тарашкевицы. Первая листовка Фронта, которая попала в руки Алесю Шутову была, как раз, написана на тарашкевице, и Алесь этого правописания не понял, приняв его за многочисленные ошибки. Он достал ручку, от руки исправил «ошибки» и вернул листовку на место..

В 1999 году в БНФ произошёл раскол - разошлись консервативные сторонники Зенона Позняка и более либеральные выходцы из молодежных организаций. Оршанская структура Фронта осталась с Позняком (КХП-БНФ), отдельные сторонники "модерновой части" остались неорганизованными. Именно Алесь Шутов через некоторое время создал в Орше структуру Партии, которая, правда, так и не была зарегистрирована, но полноценно действовала и даже имела своего местного депутата, что для того времени редкое исключение.

Краевед

Хотя и химик по образованию, Алесь увлекался историей вообще и историей Оршанщины в частности. В свое время у нескольких краеведов появилась идея написать учебник по Оршаведению (Мой родны край - Аршаншчына) и заодно ввести такую дисциплину в школах как факультатив. Идея всем понравилась, но как сделать, где взять средства - эти вопросы решить было сложно. И за дело взялся Алесь. Он не писал статей для книги (хотя знаний для этого у него хватало), он не редактировал чужих текстов, он занимался технической частью работы, поэтому его имени и нет в списках авторов - отдельно от других ему в книге посвящена надпись о том, что он был техническим руководителем проекта. Так было часто - Алесь не стремился ставить себя на первые роли, не стремился к славе, но спокойно и качественно делал технические дела - создавал надёжный тыл для других. Позже книга была переиздана, и с её страниц имя Шутова исчезло, как и имена некоторых "неблагонадёжных" краеведов.

Алесь не только изучал историю Оршанщины собственными силами, но и способствовал её изучению другими. В частности, при его поддержке была создана краеведческая секция ОМОО "Звяз", которая проводит сейчас собственные мероприятия: сбор экспонатов для музеев, поиск знаковых исторических мест, популяризация краеведческих знаний среди молодёжи. При непосредственном участии Алеся был отремонтирован памятник отряду Игнату Будиловичу в Погостище, и там начались ежегодные мероприятия, с его непосредственным участием и при его организации был реконструирован памятник на Кобыляцкой горе и прошло очень много малых мероприятий, которые при всём желании невозможно было бы перечислить все.

Журналист

Ища в библиотеках материалы по истории Оршанщины, Алесь наткнулся на газету "Оршанский вестник", которая выходила с 1915 по 1917 годы в Орше. При этом была ежедневной, что для тех времён было очень технически сложным делом. Алесь увлёкся этим изданием и мечтал создать в Орше газету с восстановленным названием и такой же периодичностью издания. Поэтому вначале он присоединился к изданию газеты "Куцейна", а после её закрытия перешёл к выпуску малотиражных бюллетеней. В некоторые времена у него получалось, включая хитрость, издавать в Орше газеты. Местная власть всеми силами старалась не допустить издания в Орше независимой газеты. Поэтому одна из оршанских газет называлась «Время» и издавалась в Минске, вторая называлась «Витебская трибуна. Оршанский выпуск", "Телевестник. Оршанский выпуск". С течением времени он прекратил тщетные попытки зарегистрировать местную газету и переключился на интернет-пространство - первым сайтом стала страница с важным для Алеся названием "Оршанский вестник". Но первая попытка стала учебной, а уже потом появился наш сайт, который за довольно непродолжительное время стал самым популярным сайтом про наш город.

Молодёжный лидер

В середине 90-х стало ясно, что быстрой победы демократии не получится - победа популиста с замашками диктатора, два референдума по возвращению советской действительности, восстановление политических репрессий и т.д. Нужно было вырабатывать долгосрочные стратегии развития, и Алесь сконцентрировался на создании молодёжных организаций. Первой была организация "Рша". А потом: Задзіночанне беларускіх студэнтаў, Гісторыка, Малады Фронт, Моладзь БНФ, МХСС и другие - это те структуры республиканских организаций, которым помогал появляться в Орше Алесь. Отдельное его детище - молодёжная организация "Звяз". Единственная зарегистрированная молодёжная организация в регионе, которая не подчиняется непосредственно исполкому и не контролируется БРСМ.

При крайне ограниченных ресурсах, через "Звяз" за 17 лет существования прошло более тысячи членов, сменилось несколько поколений правления и проведено уже более сотни различных мероприятий, в том числе, международных.

Учитель

Алесь умел учить. В своё время он решил совместить любимое дело - химию и работу, занявшись репетиторством. Если бы кто-то попытался определить лучшего репетитора по химии в городе, то, скорее всего, Алесь стал бы лучшим. Процент поступлений его учеников почти 100%, исключение составляли те кто не хотел учиться и попадал к репетитору случайно, от них он, правда, быстро избавлялся - деньги в этой работе (как и в других занятиях) для него не были решающим фактором. Когда-нибудь Алесь шутя говорил: "я подготовил около сотни сильных медиков-абитуриентов, где же потом исчезают сильные медики-молодые специалисты"?

http://orsha.eu